Организационно-методического центра Глубоковского отдела культуры Натальи Никифорович. В составе ансамбля — работники сельских домов культуры и домов фольклора всего района, а репертуар «Цярэшки» — практически необъятен.

Приятно сознавать, что в результате совместной работы на территории Витебской области Беларуси был зафиксирован обширный пласт восточнославянского музыкального материала, разнообразный в жанровом и стилевом отношениях. Экспедиция продемонстрировала хорошую сохранность песенного репертуара традиционных жанров, а также зафиксировала факт передачи знаний от старшего поколения к людям среднего возраста и к детям.

**Список литературы:**

1. Язэп Драздовіч ; укл. Н. Усава, В. Архіпава. – Мінск : Беларусь, 2013. – 96 с.

**Комментарии:**

1. В составе экспедиции 2017 года работали: руководители – И. Попова (СПбГК, доцент) и В. Красулин (БГУКИ, преподаватель); студенты – С. Баранова, А. Емельянова (СПбГК), А. Козловский, Ю. Кравчук, Н Лях, И. Хомутова, А. Шулюк (БГУКИ).

*Людміла Ражкова*

**ФАЛЬКЛОР І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ САМАСВЯДОМАСЦЬ: ПРАБЛЕМЫ І ПЫТАННІ**

*Разглядаецца ўзаемасувязь паняццяў «фальклор» і «нацыянальная самасвядомасць». Аналізуецца роля фальклору ў станаўленні беларускай нацыі.*

*Lyudmila Razhkova*

**FOLKLORE AND NATIONAL SELF-AWARENESS: PROBLEMS AND QUESTIONS**

*It examines the interconnection of the concepts of «folklore» and «national identity». The role of folklore in the formation of the Belarusian nation is analyzed.*

Заканамерна ўзмацненне ролі беларускай дзяржавы ў паступовым працэсе тварэння нацыі. Менавіта дзяржава сёння адыгрывае кіруючую ролю ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці грамадзян, дзе «фарміраванне актыўнай патрыятычнай пазіцыі, – падкрэслівае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка, – павінна стаць стрыжнем усёй выхаваўчай працы з моладдзю» [1, с. 3]. Выхаванне нацыянальна свядомай асобы становіцца актуальным педагагічным пытаннем сучаснасці.

У перыяд існавання СССР паняцце «нацыянальная самасвядомасць» выкарыстоўвалася шырока. Але станоўчым вынікам даследаванняў гэтага перыяду сталі палажэнні аб тым, што нацыянальная самасвядомасць – гэта ўласцівасць не толькі нацыі, але і асобнага грамадзяніна; што нацыянальная самасвядомасць асобы з'яўляецца паняццем сацыякультурным, яна не надаецца чалавеку ад нараджэння, а фарміруецца ў працэсе выпрацоўкі асноўных сацыяльных арыентацый; што нацыя з усімі атрыбутамі (нацыянальнай тэрыторыяй, нацыянальнай мовай, культурай, традыцыямі, звычаямі) выступае як адзін са значных кампанентаў грамадскага асяроддзя, у якім фарміруецца асоба (М.С. Джунусаў), што асяродак, у якім чалавек нарадзіўся, час, у якім ён жыве, вызначаюць яго нацыянальныя запатрабаванні, стымулююць яго ўдзел у практычных справах, уплываюць на яго эмацыянальны настрой, фарміруюць яго прыхільнасць да таго, што акаляе яго ў паўсядзённым жыцці.

Сям'я, школа, грамадства, сродкі масавай інфармацыі, дзіцячыя і грамадскія арганізацыі, нефармальныя групоўкі, непасрэднае бытавое асяроддзе і іншае паступова пераўтвараюць асобу ў носьбіта агульнапрызнанай ідэалогіі, светаўспрымання і светаадчування. Сярод сацыяльных інстытутаў, якія садзейнічаюць фарміраванню і развіццю нацыянальнай самасвядомасці асобы, вядучая роля, безумоўна, належыць школе, і не толькі таму, што яна з'яўляецца асноўным носьбітам інфармацыі аб сваім народзе. У агульнаадукацыйнай школе працэс фарміравання асобы набывае мэтанакіраваны характар. Таксама і мастацкае аматарства ў распаўсюджванні духоўна-культурных каштоўнасцей і іх актыўным творчым засваенні людзьмі мае значна больш магчымасцей. Бо гэтая дзейнасць здзяйсняецца ў вольны час і мае добраахвотны характар, характарызуецца воляй выбару і ініцыятыўнасцю, асабістай скіраванасцю і запатрабаваннямі асобы.

Сцвярджаецца, што мастацкае аматарства застаецца незаменным у культурным працэсе вяртання каштоўнасцей фальклору ў жыццё нашых сучаснікаў, што яно застаецца амаль што адзінай сферай дзейнасці, дзе існуюць рэальныя магчымасці адраджэння фальклорных традыцый і маецца магчымасць рэалізацыі этнічнай самаідэнтыфікацыі яе ўдзельнікаў (В.Я. Гусеў, Э.Я. Аляксееў, Ю.М. Кулікоў і іншыя навукоўцы) [2]. Аднак нагадаем даследаванне Л.І. Міхайлавай, якая сцвярджае, што ўспрыманне фальклору як культуры этнасу, як культуры, што ўвасабляе характар народа, яго дух, успрыманне фальклору як сродку этнічнай самаідэнтыфікацыі выражана недастаткова – 9 % апытаных [3, с. 140]. Не ўспрымаецца фальклор і як спосаб баўлення вольнага часу, зносін і адпачынку – 6 % і 2 % адпаведна.

Як звязаны паміж сабой паняцці «фальклор» і «нацыянальная самасвядомасць»? Нам падаецца, што спачатку трэба разгледзець звязку «фальклор – народная самасвядомасць», бо гэтыя вызначэнні аднаго ўзроўню.

Згодна тэкстам фальклорных узораў, народная самасвядомасць [4] мела наступныя формы: мясцовую, сацыяльную, этнічную (праяўлялася ў форме саманазвы этнасу – у спажыванні этноніма) і рэлігійную. Аналіз наяўнасці розных форм народнай самасвядомасці ў фальклорных творах праводзіўся Ю.І. Смірновым [5]. За аснову для аналізу аўтар узяў тэксты са зборніка П.В. Шэйна, у якім налічваецца каля 800 узораў фальклорных твораў рознай жанравай скіраванасці. «Матэрыялы да вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю …» з'яўляюцца адной з першых грунтоўных прац па вывучэнні народнай творчасці беларусаў. Гэтая праца зафіксавала змест самасвядомасці народа, якім ён быў менавіта ў феадальную эпоху, яшчэ не кранутую капіталістычнымі адносінамі, якія нараджаюцца, бо працэсы фальклорнай творчасці крыху спазняюцца адносна сацыяльна-гістарычных падзей.

Значна раней за ўсе віды народнай самасвядомасці ўзнікла яе мясцовая форма, якая характарызуецца словам «тутэйшы», праяўляецца ў называнні насельніцтвам сябе «мясцовымі», «тутэйшымі». Гэтая форма народнай самасвядомасці, безумоўна, адна з самых зменлівых, рухлівых падчас міграцыйных працэсаў. Мясцовая форма больш яскрава выяўлена ў пласце раннетрадыцыйных твораў (у каляндарна-абрадавых і сямейна-абрадавых песнях, казках). Так нашы продкі ў казках ці абрадавых тэкстах пазбягалі вызначаць этнічную прыналежнасць герояў і давалі ім толькі імя. Радзей зазначалася тая ці іншая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мясцовасць, паселішча, дзе яны нарадзіліся. Характэрна, што гэтую форму самасвядомасці магчыма знайсці і ў самым старажытным пласце агульнаславянскага існавання, які адлюстраваўся ў фальклорных творах. Так, Л.М. Салавей у сваім даследаванні сцвярджае, што група архаічных вобразаў: «Дунай», «мора», «явар», «ціс», «вінаград», якія з'яўляюцца бадай што самымі любімымі і пашыранымі ў тэкстах розных жанраў беларускай вуснай народнай творчасці, нясе вельмі значную сэнсавую нагрузку. У рэальных абставінах жыццядзейнасці нашых продкаў яны не знаходзілі прататыпаў. Усім сваім комплексам яны адлюстроўвалі сувязь з іншым геаграфічным арэалам, іншым месцам рассялення – прыдунайскім арэалам існавання славянства. Іх глыбінная напоўненасць зараз не заўсёды ўсведамляецца носьбітамі і спажыўцамі фальклору і ўспрымаецца імі хутчэй як эстэтычная дасканаласць, упрыгожванне, арнаментальнасць [6]. Адсюль, поруч з рэальным тэрытарыяльным рассяленнем беларускага народа, адлюстраваным у яго фальклорнай памяці, прысутнічае і памяць аб калысцы ўсходнеславянскіх народаў, што і зафіксавана ў вобразах прыдунайскага арэалу. Гэта адна з кропак збліжэння народаў-суседзяў пры фарміраванні этнічнай самасвядомасці іх прадстаўнікоў у наш час. Не толькі агульначалавечыя каштоўнасці, якія ўтрымлівае фальклор нашых краін, яднае нас, але і памяць аб той даўніне, калі мы ўсе былі адным пранародам.

Даволі поўна ў фальклорных творах прадстаўлены рэлігійная (адлюстраванне ў творах атрыбутаў праваслаўнай і каталіцкай канфесій) і сацыяльная (супрацьпастаўленне валадароў польскіх або рускіх і «мужыкоў», прадстаўнікоў карэннага этнасу) самасвядомасці. Як паказаў аналіз Ю.І. Смірнова, этнічная форма самасвядомасці (адлюстраванне ў творах этноніма народа) сярод іншых форм сустракаецца значна менш. У «Матэрыялах …» П.В. Шэйна вельмі часта сустракаюцца этнонімы іншых краін, такіх як Украіна, Турэцкая зямля. Раз-пораз згадваецца Масква, Русь (Руская зямля) і таксама Польшча. У некаторых зачынах гаворыцца: «Ляцяць гусі з Цёмнай Русі» (№ 377в), ці «Ляцяць гусі з Белай Русі» (№ 404). Але далейшае разгортванне сюжэту не дае нам ніякіх звестак, дзе гэтая мясцовасць знаходзіцца адносна зямлі выканаўцы.

Такім чынам, фальклорная традыцыя захавала і данесла да нашага часу пэўны комплекс форм народнай самасвядомасці. Сярод іх прэваліруюць рэлігійная і мясцовая. Трошкі менш пашырана сацыяльная. Этнічная ж яе форма (і ў гэтым адметная рыса станаўлення беларускай нацыі) у перыяд феадальнай раздробненасці і ў час збірання новай дзяржавы беларусаў праяўлялася слаба. Нязменнае ўладарства на этнічнай тэрыторыі беларусаў (пасля распаду Вялікага Княства Літоўскага) іншаземных прадстаўнікоў не спрыяла яе ўмацаванню.

У наш час на першы план выходзяць другасныя формы фальклору. На дадзеным этапе свайго існавання ён выступае як нацыянальная каштоўнасць. А звязана гэта з тым, што са зменамі, якія адбыліся ў эканамічным жыцці народа, фальклор перастае адыгрываць тую сістэмаўтваральную ролю, якую ён адыгрываў дагэтуль. Умовы далейшага развіцця нашай краіны выклікалі патрэбнасць ва ўніфікаванай форме перадачы інфармацыі, у агульнанацыянальнай літаратурнай мове, перапрацоўцы існуючых этнічных мясцовых традыцый мовы і культуры. Фальклор уяўляецца як неабходная крыніца этнічных ведаў, матэрыял для пабудовы нацыянальнай культуры, як гарант захаванасці этнічнай своеасаблівасці, крытэрый адрознення адной нацыі ад другой. Шырока вядомыя фальклорныя песенныя ўзоры сацыяльнага характару выкарыстоўваюцца для кансалідацыі нацыі, таму што яны абуджаюць патрыятычныя пачуцці ў прадстаўнікоў адной этнічнай супольнасці, яднаючы іх.

Сапраўдная аднароднасць духоўнай культуры этнасу падчас этнічнай кансалідацыі развіваецца не ў фальклорнай сферы, а ў сферы прафесійнай літаратурнай і музычнай творчасці. Фальклорная традыцыя кожнага этнасу лакальная. Тым не менш, у перыяд станаўлення нацыі фальклор актыўна выкарыстоўваецца пры выпрацоўцы нацыянальнай культурнай аднароднасці. Гэты працэс вядзе да стварэння ўмоўна-традыцыйных абагульненых і агульнанацыянальных форм, якія супадаюць ці не супадаюць з рэальна існуючымі лакальнымі традыцыйнымі формамі. Некаторыя творы (для Беларусі, напрыклад, такія песні, як «Ой рэчанька, рэчанька», «Купалінка») становяцца сімваламі, рэпрэзентамі традыцыйнай нацыянальнай культуры, асабліва для прадстаўнікоў беларускай дыяспары ў іншых краінах, адначасова яны складаюць ядро беларускай нацыянальнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс літаратуры:**

1. Лукашенко, А. Современное белорусское государство : социальная структура, политические институты, идеология / А. Лукашенко // На страже. – 1998. – 4 дек. – С. 3.
2. Алексеев, Э. Фольклор в контексте современной культуры: рассуждения о судьбах народной песни / Э. Алексеев. – М. : Совет. композитор, 1988. – 236 с.
3. Михайлова, Л. Народная художественная культура: детерминанты, тенденции, закономерности социодинамики / Л. Михайлова. − М. : Вузовская книга, 2001. – 264 с.
4. Чистов, К. Этническая общность, этническое сознание и некоторые проблемы духовной культуры / К. Чистов // Совет. этнография. – 1972. – № 3. – С. 73–85.
5. Смирнов, Ю. О народном самосознании: (по фольклорным материалам) / Ю. Смирнов // Культура и общество в эпоху становления наций. Центральная и Юго-Восточная Европа в конце XVIII –70-х годах XIX в. : сб. ст. / АН СССР, Ин-т славяноведения и балканистики ; ред. И. Богданова. – М., 1974. – С. 55–62.
6. Узроўні агульнасці фальклору ўсходніх славян / Л. Барабанава, Г. Барташэвіч, К. Кабашнікаў [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 477 с.

***Елена Миланич***

**ТРАДИЦИОННАЯ КУЛЬТУРА В СИСТЕМЕ ОБУЧЕНИЯ И ПРАКТИКИ МУЗЫКОТЕРАПИИ**

*Метод фольклоротерапии рассмотрен как актуальная форма использования воспитательного и коррекционно-психологического аспектов фольклора в современном обществе.*

***Yelena Milanich***

**TRADITIONAL CULTURE IN THE SYSTEM OF TRAINING AND PRACTICE OF MUSICOTHERAPY**

*The method of folklore therapy is analyzed as an actual form of using the educational and correctional-psychological aspects of folklore in modern society.*